# УМБОНАПАДОБНАЯ ЗАВУШНІЦА РАННЯГА ЖАЛЕЗНАГА ВЕКУ З ГАРАДЗІШЧА РАГАЧОВА

**Дз. А. Атрохаў**

*Беларускі дзяржаўны універсітэт, г. Мінск;*
*his.atrohov@bsu.by;*
*навук. кір. – А. Дз. Сахончык*

У працы прадстаўлена ўмбонападобная завушніца, якая была знойдзена падчас раскопак у г. Рагачоў. Прадмет адносіцца да ранняга жалезнага веку (VI–V ст.) і суадносіцца са старажытнасцямі мілагардскай культуры..

***Ключавыя словы:*** умбонападобная завушніца; Рагачоў; мілаградская культура.

У дадзенай працы будзе прадстаўлена умбонападобная завушніца з гарадзішча Рагачова (*Мал.* 1). Прадмет быў знойдзены падчас археалагічнай практыкі гістарычнага факультэта БДУ ў 1976 г. Кіраўніцтва экспедыцыяй ажыццяўляў Э. М. Загарульскі, які на працягу трох год (1973, 1975, 1976 гг.) кіраваў раскопкамі на тэрыторыі горада. Усяго на помніку за тры сезона працы было закладзена чатыры раскопы агульнай плошчай1280 м$^2$ [3, с.1; 4, с. 1; 5, с. 1].



Умбонападобная завушніца з гарадзішча Рагачова (фота аўтара)

Рагачоўскае гарадзішча месціцца ў паўднёвай частцы сучаснага горада і займае край мыса вышынёй каля 11–12 м пры ўпадзенні р. Друць у Дняпро. Пляцоўка пакатая, мае заўважны схіл з цэнтра гарадзішча ў бок краёў, памерам 125×90 м, форма блізкая да трохвугольніка [3, с. 1].

Культурны слой вельмі перакапаны, пра што сведчыць знаходжанне ў розных слаях рэчаў, характэрных для жалезнага веку, старажытнарускага часу і пазнейшых часоў. Акрамя гэтага, на помніку месціліся хрысціянскія могілкі, пра што сведчаць поза і арыентыроўка нябожчыка. Падчас раскопак было ўскрыта 39 пахаванняў, арыентаваных з захаду на ўсход і ляжаўшых у асобных месцах у некалькі ярусаў. Найбольшая канцэнтрацыя пахаванняў назіралася ў паўночна-заходняй частцы раскопа 1975 г. Каля некаторых пахаванняў былі згойдзены рэшткі драўляных

трунаў. Меліся дзіцячыя касцякі. Але ніякіх знаходак, акрамя каваных і грубых цвікоў, у пахаванях не было выяўлена [4, с. 2]. Магільныя ямы ў шматлікіх месцах дасягаюць мацярыка, толькі вузкая частка перадмацярыковага слою пазбегла поўнага знішчэння [4, с. 5]. Асабліва моцныя парушэнні культурнага слою маюцца на поўдні даследаванай пляцоўкі. Так, паўднёва-ўсходняя частка раскопа I змяшчае ў сябе траншэю, засыпаную пяском, якая перасякае раскоп з поўначы на поўдзень, а каля паўночнай частцы раскопа разыходзіцца на захад і усход амаль пад прамым вуглом [3, с. 5]. Раскоп 1976 г. мае найбольшае пашкоджанне культурнага слою. Асабліва добра гэта прасочваецца наяўнасцю траншэй, бліндажных ям, акопаў, што звязваецца з умацаваннямі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Найбольш пацярпела частка – цэнтр раскопа 1976 г. [5, с. 5]. Улічваючы актыўнае выкарыстанне пляцоўкі гарадзішча ў розныя эпохі, стратыграфія ў пэўнай ступені ўмоўная. Пры гэтым Э. М. Загарульскі вылучае два асноўныя перыяды ў існаванні помніка: жалезны век і старажытнарускі час [3, с. 2, 6–7; 4, с. 2, 8; 5, с. 2–3].

Завушніца зроблена з бронзы, пакрыта пацінай светла-зялёнага колеру. Шчыток акруглы з умбонападобным выступам у цэнтральнай частцы. На прадмеце прысутнічае скразная адтуліна, якая, верагодна, з’яўляецца следствам браку ліцця. Механічных пашкоджанняў на месцы адтуліны выяўлена не было. Дыяметр шчытка 28 мм, даўжыня вырабу ад края умбона да вышэйшай кропкі 7,2 мм. З тыльнага боку вяршыні конусу адыходзіць прыпаяная дужка з дроту акруглай формы, дыяметр якога 2 мм. Захавалася толькі частка дужкі памерам 1,3 мм. Злом стары. Прадмет выраблены пры дапамозе ліцця. На карысць гэтага сведчаць невялікія дэфекты, якія бачныя з унутранага і вонкавага боку прадмета: характэрныя выплескі бронзы, з прычыны чаго паверхня набыла бугрыстую форму. Знаходка, як і іншыя матэрыялы даследавання Э. М. Загарульскага з помніка, захоўваецца ў зборы вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ.

Перад тым як перайсці да аналізу і пошуку аналогій у старажытнасцях жалезнага веку варта адзначыць некаторыя моманты. Завушніцы з шчытком канічнай формы даволі шырока прадстаўлены на помніках жалезнага веку лясной і лесастэпавай зон. Пры гэтым варта адзначыць, што на розных тэрыторыях існавалі пэўныя асаблівасці і адрозненні [6, с. 39, мал. 1: 15; 9, с. 63, мал.32: 1–3; 14, с. 28; 15, с. 173; 13, с. 361].

На тэрыторыі паўднёвай Беларусі вядома чатыры завушніцы з канічным шчытком: Азарычы, Гарошкаў, Снядзін I [2, с. 43, мал. 8, 10; 10, с. 210]. Пры гэтым знаходка з Азарычаў не бронзавая, як наша, а зроблена з золата. Што робіць дадзены экзэмпляр больш рэдкім.

Завушніцы з канічынам шчытком складаюць чацвёртую частку сярод падобных упрыгожанняў, якія паходзяць з помнікаў мілаградскай культуры [10, с. 210]. Пра мясцовую вытворчасць умбонападобных упрыгожванняў сведчаць знаходкі на Мохаўскім II гарадзішчы ліцейных форм для адліву упрыгожванняў дадзенага тыпу [11, с. 82].

Пэўныя адпаведнікі можна адзначыць ў класіфікацыі В. Г. Пятрэнка, якая займалася даследаваннем упрыгажэнняў на тэрыторыі лесастэпу ў раннім жалезным веку [10, с. 210; 12, с. 27]. Найбольш блізкімі з'яўляюцца завушніцы пятага тыпу пятага варыянта, якія маюць выцягнутую вяршыню конуса на шчытку [10, с. 210; 12, с. 27]. Дадзены варыянт таксама сустракаецца на помніках басейна Сейма, лужыцкай, юхнаўскай і днепра-дзвінскай культур і датуецца VI – пачаткам V ст. да н. э. [7, с. 68; 12, с. 27; 15, табл. 15: 7-9].

Такім чынам, завушніца з канічным шчытком, якая паходзіць з гарадзішча Рагачова адносіцца да мілаградскай культуры, так як у арыяле мілаградскай культуры быў шырока распаўсюджаны дадзены варыянт завушніц [9, с. 62; 10, с. 210]. Таксама на мілаградскім гарадзішчы былі выяўлены ліцейных формы для вырабу такіх упрыгажэнняў [11, с. 82]. Акрамя гэтага, завушніцы пятага тыпу пятага варыянта на помніках для басейна Сейма, юхнаўскай і днепра-дзвінскай культур менш характэрны і адыгрывацюь пераходную ролю да умбонападобных завушінц тыпу сем помнікаў басейна Масква-ракі [8, с. 145]. Таксама завушніцы пятага тыпу пятага варыянта паўплывалі на ўмбонападобныя ўпрыгожванні Падзвіння [1, с. 13]. На падставе аналогій з іншых помнікаў мілаградскай культуры можна адзначыць, што наш экзэмпляр датуецца ў межах VI – пачаткам V ст. да н. э. [9, с. 62; 10, с. 210; 12, с. 27]. Лічыцца, што дадзеныя ўпрыгожванні на тэрыторыі Беларусі характэрныя для жаночага комплексу ўпрыгожанняў. Таксама, неабходна адзначыць, што завушніцы з кананічным шчытком не з'яўляюцца самымі распаўсюджанымі сярод завушніц мілаградцаў. Больш папулярныя былі завушніцы з грыбападобным шчытком, а таксама галінападобныя, сегментападобныя [10, с. 211].

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Бубенька, Т. С.* Об одном типе умбонападобных подвесок в Витебском Подвиньи и Оршанским Поднепровь / Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Даследаванне беларускіх старажытнасцей (да 80-годдзя з дня нараджээння) / Гал. рэд.: В. М. Ляўко. – Вып. 31. – Мінск: Беларуская навука, 2020. – с. 10–15.
2. *Вергей, В. С.* Западный ареал милоградской культуры // ГАЗ. № 7. 1995. С. 83–100.

3. *Загорульский, Э. М.* Отчет о работах археологической экспедиции Белгосуниверситета им. В.И. Ленина в 1973 году / Э. М. Загорульский // ЦНА НАН Беларусі. – ФАНД. Воп. 1. Арх. № 450.
4. *Загорульский, Э. М.* Отчет о работах археологической экспедиции Белгосуниверситета им. В.И. Ленина в 1975 году / Э. М. Загорульский // ЦНА НАН Беларусі. – ФАНД. Воп. 1. Арх. № 523.
5. *Загорульский, Э. М.* Отчет о работах археологической экспедиции Белгосуниверситета им. В. И. Ленина в 1976 году / Э. М. Загорульский // ЦНА НАН Беларусі. – ФАНД. Воп. 1. Арх. № 545.
6. *Каравайко, Д. В. Горбаненко С. А.* Господарство носіїв юхнівської культури / Д. В. Каравайко, С.А. Горбаненко - Ки́їв: Наук. думка, 2012. — 304 с.
7. *Кренке, Н. А.* Дьяково городище: культура населения бассейна Москвы-реки в I тыс. до н.э. – I тыс. н.э. – М.: ИА РАН, 2011. – 548 с.: ил.
8. *Кренке, Н. А. Лазукин А. В., Тавлинцева Е. Ю.* Клад украшений с городища Дютьково / Российская археология. – 2011. – № 1. – С. 134–148.
9. *Лашанкоў, М. І.* Матэрыяльная культура і заняткі насельніцтва / М .І. Лашанкоў // Археалогія Беларусі: У 4 т. Т. 2. Жалезны век і ранняе сярэднявечча / А. А. Егарэйчанка, В. І. Шадыра, В. С. Вяргей і інш.; Пад рэд. В. І. Шадыры, В. С. Вяргей. – Мн.: «Беларуская навука», 1999. –502 с. С. 46-70: іл.
10. *Лошенков, М. И.* Городища милоградской культуры на территории Беларуси. – Мн.: МФЦП, 2011. – 408 с., ил.
11. *Мельниковская, О. Н.* Племена Южной Белоруссии в раннем железном веке / О. Н. Мельниковская. - Москва: «Наука», 1967 – 167 с.
12. *Петренко, В. Г.* Украшения Скифии VII–III вв. до н.э. / В. Г. Петренко // САИ. – 1978. – Вып. Д4-5. – 144 с.
13. *Полит Б.* Гвоздевидные серьги с территории Украины и Польши / Б. Полит // Боспорские стения. Вып. XI. Боспор Киммерийский и варварский мир в период античности и средневековья. Ремесла и промслыы. / Ред.-сост. д.и.н. В. Н. Зинько – Керчь. – 2010. – С. 356–362.
14. *Сахончик, О. Д.* Новые находки предметов вооружения и украшений раннего железного века с территории Брестской облости (в собрании учебной лаборатории музейного дела исторического факультета БГУ) / О.Д. Сахончик // «Музейныя здабыткі»: материалы I Международной научно-практической конференции «Историко-культурное наследие Бреста и Брестчины в музейных собраниях» – Брест, 2020. – С. 25–33
15. *Шмидт, Е. А.* Племена верховьев Днепра до образования древнерусского государства: 1. Днепро-двинские племена (VIII в. до н. э. – III в н. э.) / Е. А. Шмидт; Смоленский государственный педагогический университет им К. Маркса; рец.: рец.: Д. А. Авдусин, Д. И. Будаев. – М.: Прометей, 1992. – 208 с.